# Новое поступление в библиотеку.

**І.А.Марзалюк «Ад Русі і Літвы да Беларусі: вытокі і генезіс беларускага народа»**




Гэта кніга аб нашай этнічнай і нацыянальнай тоеснасці, гісторыі нашага самаўсведамлення, нашай адметнасці.


Ігар Марзалюк

Гродзенскі, ковенскі і мінскі генерал-губернатар У. Назімаў выдатна разумеў, чаго хоча мясцовая эліта. Яе мэта — паланізацыя асноўнай масы ўсходнеславянскага сялянскага насельніцтва заходніх губерняў, ператварэнне яго праз моўную і ментальную асіміляцыю ў палякаў: *«...польское дворянство... при помощи [католического] духовенства впилось, так сказать, в тело и кровь украинского, литовского и белорусского населения»*[586].

Менавіта таму У. Назімаў быў катэгарычна супраць перадачы ў рукі шляхты пачатковых школ. Ён выдатна разумеў, якая гэта магутная зброя ў якасці інструмента паланізацыі: *«...оно [польское дворянство] могло бы впоследствии, опираясь на повсеместное укоренение польского языка... с большею законностью заявлять права свои на этот народ»*[587].

Уладзімір Назімаў (1802—1874).

Беларусь у складзе Расійскай імперыі. Карта С. Цемушава.

Ад Русі і Літвы да Беларусі: вытокі і генезіс беларускага народа

Мікалай Мілюцін (1818—1872). Аляксандр Гільфердзінг (1831—1872).

У сувязі з гэтым у асяроддзі інтэлектуальнай эліты імперыі, якая асэнсоўвала пагрозу польскіх шавіністычных памкненняў у дачыненні да не польскага насельніцтва Заходняга краю, узнікла думка аб умацаванні і развіцці мясцовай этнічнай і культурна-рэгіянальнай тоеснасці — беларусаў, літоўцаў, украінцаў. У такім кантэксце ў канцы 1850-х — пачатку 1860-х гг. у сталіцы імперыі выкарыстанне мясцовых «наречий» у пачатковай школе адстойваў міністр народнай асветы А. В. Галаўнін[588]. Гэтыя ідэі былі з энтузіязмам падтрыманы і асобнымі прадстаўнікамі мясцовых эліт тагачаснай Беларусі. У прыватнасці, гэту ідэю горача падтрымліваў віленскі выдавец і гісторык А. Кіркор, віленскі маршалак А. Дамейка, навагрудскі маршалак У. Брахоцкі[589].

У пачатку 1860-х гг. гурток Мікалая Мілюціна супольна са славянафільскі арыентаванымі навукоўцамі і публіцыстамі, лідарам якіх быў Аляксандр Гільфердзінг, распрацоўваў ідэю аб падтрымцы культурнамоўных адметнасцей мясцовага сялянскага насельніцтва ў супрацьвагу дваранскім і клерыкальным польскім і каталіцкім элітам. Паводле задумы аўтараў, падобная палітыка дапамагла б беларусам і ўкраінцам, а таксама літоўцам асэнсаваць сваю адметнасць і асобнасць ад палякаў. Гэта, на думку славянафілаў, спрыяла б, у сваю чаргу, умацаванню агульнарускага імперскага адзінства.

212 213

Нараджэнне любой нацыі заўсёды суправаджаецца з’яўленнем гістарычнай міфалогіі ці стварэннем такога варыянта гісторыі, у якім у якасці асноўнага суб’екта даследавання паказваецца гісторыя ўласнага народа. У нацыянальна вызначанай версіі гісторыі заўсёды ёсць свая ўнутраная логіка, свая іерархія асноўных прыярытэтаў і вартасцей. На этапе станаўлення нацыянальнай ідэнтычнасці новая нацыянальная гістарыяграфія заўсёды мае палітызаваны і міфалагізаваны характар.



Злотнік Уладзіміра Святаславіча. Канец X — пачатак XI ст.

Баварскі географ, датаваны па палеаграфічных прыкметах X ст., паведамляе аб чатырох вядомых паводле старажытнарускага летапісу этнонімах: улічах, северанах, ляндзянах і бужанах. Так званае «яўрэйска-хазарскае ліставанне» другой паловы X — пачатку XI ст. зафіксавала этнонімы вяцічаў, северан і славян[29].

Апавядаючы аб тым ці іншым усходнеславянскім «родзе» (усходнеславянскім племені), Нестар цудоўна ўсведамляе яго этнічную адметнасць.



Князь у «залатым» шлеме. X ст.



«Залаты» княжацкі шлем. Бабруйск. Канец X — пачатак XI ст.

Гісторык з вучонага ператвараецца ў нацыянальнага ідэолага, з-пад пяра якога вымалёўваецца гістарычная традыцыя, уваскрашаецца пантэон нацыянальных герояў, якім супрацьстаяць адвечныя ворагі. Пра людзей, якія стваралі гэты пантэон, змагаліся за беларускую адметнасць, гэта кніга.



Караімы.

Праўда, у гэты час афіцыйная тытулатура вялікага князя Казіміра яшчэ заставалася ранейшай, такой самай, якую меў і Вітаўт, аб чым сведчыць дагаворная грамата 1440 г. з Вялікім Ноўгарадам: *«Се яз великий князь Казимир, королевич, всее Литовское земли и Жомойцкое и многих Руских земель»*[106].

Аднак ужо ў дагаворнай грамаце 1449 г. Казіміра з вялікім князем маскоўскім Васілём яго тытулатура становіцца сінанімічнай летапіснай. Калі вялікі князь маскоўскі ў дакуменце тытулуецца як *«Московский и Новгородский и Ростовский и Пермьский и иных»*, то ў тытуле Казіміра адбіваецца комплекс уяўленняў аб прыналежнасці яму Рускай зямлі: *«дали есмо се запис брату нашому Казимиру, королю Полскому и великому князю Литовскому и Рускому и Жомойтскому и иных»*[107].

Падобная сістэма ўяўленняў прасочваецца і ў лісце ад праваслаўных князёў ВКЛ да Канстанцінопальскага патрыярха з просьбай аб благаславенні на Кіеўскую мітраполію абранага імі полацкага архіепіскапа Іоны. Князі (у тым ліку і праваслаўныя Гедымінавічы) прызнаюць сваю рускую этнічнасць *(«Сынове послушания ти князи руские»)* і праваслаўную самаідэнтыфікацыю *(«иже держащие веру православную греческую»)*. Русь жа знаходзіцца ў межах ВКЛ: *«живущии под державою великого господаря, наяснейшого пана Казимира, короля Польского и Великого Князя Литовского и Рускаго»*[108]. Устойліваму замацаванню падобных уяўленняў мусіў таксама спрыяць канчатковы падзел Кіеўскай мітраполіі і скарыстанне «літоўскім» мітрапалітам тытула «Всея Руси». Значэнне дадзенай акалічнасці калі не было вызначальным, то, напэўна, надзвычай істотным для паглыблення этнічнай дыферэнцыяцыі



Жыльбер дэ Лануа (1386—1462).